# УРОК-ДОСЛЕД “ПРАВАПІС У І Ў”

# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў V КЛАСЕ

**Н. І. КУРАТНІК,**
***настаўнік беларускай мовы і літаратуры***
***першай кваліфікацыйнай катэгорыі***
***ДУА “Гімназія №2 г. Пінска”***

**Мэта ўрока:** узнавіць і замацаваць веды вучняў пра асаблівасці літар *у* і *ў*, на аснове першапачатковых звестак, атрыманых у пачатковай школе, садзейнічаць пашырэнню і паглыбленню ведаў аб правапісе літар у і ў.

**Задачы:**

- стварыць умовы для ўзнаўлення і паглыблення ведаў вучняў пра асаблівасці правапісу літар *у* і *ў*;
- садзейнічаць развіццю звязнага вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, іх аналітычных здольнасцей;
- выхоўваць пачуццё адказнасці за вынікі сваёй працы на ўроку, спрыяць павышэнню матывацыі да вывучэння роднай мовы.

**Абсталяванне:** беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Красней В.П., Лаўрэль Я.М., Васюковіч Л.С., Несцяровіч В.І. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2014 г.; карткі з заданнямі, мультымедыйная прэзентацыя да ўрока, схема “Правапіс у, ў”.

**ТЫП УРОКА:** урок вывучэння новага матэрыялу з элементамі даследчай дзейнасці вучняў.

**ТЭХНАЛОГІЯ:** развіццёвае навучанне.

## Ход урока

### I. АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАТЫВАЦЫЙНЫ ЭТАП

**Настаўнік.** Добры дзень! Я спадзяюся, што сённяшні дзень сапраўды добры, таму што быў напоўнены радасцю ад маленькіх адкрыццяў, якія вы рабілі на кожным з папярэдніх урокаў. Хочацца, каб такім адкрыццём для кожнага з вас быў і наш сённяшні ўрок роднай мовы.

### II. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ

Пачынаем урок з праверкі дамашняга задання. Успомніце, якую тэму мы вывучалі на мінулым уроку?

***Выкананне задання, аналагічнага дамашняму (на картках).***

Умова: прачытаць сказы, уставіць, дзе неабходна, **ь** ці ’, растлумачыць свой выбар.

*Каб смачна пад…есці і хораша хадзіц.., трэба многа рабіц... . Не раскусіўшы арэх, зерне не з…ясі. Работа і корміц…, і поіц…, і жыц… вучыц…. У гул…тая і страха цячэ, і печ не пячэ.*

**Настаўнік.** Чым з’яўляюцца прачытаныя сказы?

***Стварэнне псіхалагічнага настрою на ўрок.***

**Настаўнік.** А цяпер уважліва паслухайце верш Р. Барадуліна і вызначце, што аб’ядноўвае яго і прааналізаваныя прыказкі.

Назаўтра,
Як пачаўся ўрок,
Гультай трымаўся смела:
Падказка тут непадалёк —
За першай партай села.
Настаўнік гультая якраз
Паклікаў.
Стала ціха,
А ён ні "а", ні "бэ" ў адказ,
Што сталася са слыхам?
Крычыць Падказка — ўсё адно
Не чуе ён, ды й годзе.
І вось настаўнік двойку зноў
У дзённіку выводзіць.
Яшчэ быў выкліканы ён.
А за падказ Падказку
Настаўнік выгнаў з класа вон —
Час і закончыць казку.

**Вучань.** Верш і прыказкі аб’ядноўвае тэма і асноўная думка: асуджэнне гультаёў.

**Настаўнік.** Чаму яны нас вучаць?

**Вучань.** Старанна працаваць, не ленавацца, не лодарнічаць, не гультайнічаць.

**Настаўнік.** Спадзяюся, што кожны з вас будзе старанна працаваць на ўроку, каб не быць падобным на героя верша.

## ІІІ. ТЛУМАЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Настаўнік.** Казка пра гультая закончылася, а наш урок толькі пачынаецца, і пройдзе ён у не зусім звычайнай форме. Вызначыць яе нам дапаможа заданне “Расшыфруй слова”.

***Работа ў парах.*** Умова: паставіць літары, запісаныя на дошцы, у правільным парадку і прачытаць слова (падказка: слова пачынаецца і заканчваецца на літару д): урок-**д о д л е с (дослед).**

**Настаўнік.** Сапраўды, у форме доследу або даследавання. Падбярыце да слоў *дослед, даследаванне* аднакаранёвыя. Падумайце, якія адносіны гэтыя словы будуць мець да сённяшняга ўрока. (Вы на ўроку будзеце не толькі вучнямі, а і *даследчыкамі,* а гэта значыць, будзеце не проста атрымліваць веды, а вучыцца *даследаваць*).

Вызначыць, што будзе **тэмай (аб’ектам)** нашага даследавання, дапаможа наступны тэкст.

*Гэта ўнікальная літара беларускага алфавіта. Яна адсутнічае ў азбуках іншых славянскіх моў. Упершыню ў алфавіце сучаснай беларускай мовы літара з’явілася толькі ў канцы 19 стагоддзя. Менавіта ёй пастаўлены помнік у адным з гарадоў Беларусі.*

–Як вы лічыце, пра якую літару ідзе гаворка?

– Сапраўды, пра літару **Ў**. Падумайце, правапіс якой яшчэ літары мы будзем вывучаць разам з ў.




**Мэтамеркаванне вучняў.**

**Успомнім:** што мы ведаем пра літары у і ў з пачатковай школы.

**Даведаемся:** калі ў беларускай мове пішуцца літары у і ў.

**Навучымся:** правільна пісаць словы з дадзенымі арфаграмамі.

**Актуалізацыя ведаў вучняў.**

Падумайце, чаму літара і адпаведны гук называюцца нескладовымі.

**Праца з падручнікам.**




Адказаць на пытанне нам дапаможа пр.50 с.27. (1 слупок)

Параўнаем адказ з правілам на с. 27 (1 абзац). Ці правільны вывад мы зрабілі?

Успомнім, што нам вядома аб правапісе літар у і ў?

**Гіпотэза:** літару **у** пішы ў пачатку сказа, пасля зычных і пасля знакаў прыпынку, а літару **ў** – пасля галосных.

**Праца з тэкстам (на картках).**

**Каменціраванае пісьмо.**




Умова: запісаць, растлумачыць правапіс літар у і ў

***У(ў)*** *верасні 2003 года* ***у(ў)*** *час святкавання Дня беларускай пісьменнасці* ***ў*** *Полацк****у*** *адбылося* ***у(ў)****рачыстае адкрыццё помніка* ***у(ў)*** *гонар* ***у****нікальнай літары* ***у(ў)****. Ён зроблены* ***у(ў)*** *выглядзе стэлы, на гранях якой размешчаны рэльефныя выявы літары. Помнік можа слу(ў)жыць і сонечным гадзіннікам.*

**Дэманструецца слайд з выявай помніка.**

**Фізкультхвілінка.**

Настаўнік спытае – трэба ўстаць.
Калі дазволіць сесці – сядзь.
Адказаць хочаш – не шумі,
А руку акуратна падымі.

**Стварэнне праблемнай сітуацыі:** аналізуем словы, запісаныя ў два слупкі, тлумачым правапіс слоў: *каля ўнівермага**,** каўнер, ішоў, паўза, на ўзлеску, прысе**ў**.*

Ці можам мы растлумачыць правапіс слоў другога слупка?

*каля **урны**, трыумф, кінатэатр “Перамога” ўзнавіў паказ, паўночн**а-ў**сходні, шо**у**, со**ус**, акварыу**м**, да Уладзіслава.* (Запісваем па ходу аналізу)

Звярніце ўвагу на тое, у якой пазіцыі пішуцца выдзеленыя літары ў словах. Паэтапна фармулюем вывад, калектыўна дапаўням схему “Правапіс літар у і ў” (на дошцы).

Пішы

Літару ў

1. Пасля галосных.
2. Пасля двукосся і злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны.

Літару у

1. У пачатку і сярэдзіне слоў пад націскам.
2. На канцы запазычаных слоў, у тым ліку на **–ум, -ус.**
3. У пачатку ўласных імён.
4. Пасля знакаў прыпынку.

На ст. 28 знаходзім выпадак правапісу літары **у**, які на схеме пакуль не адлюстраваны. Дапаўняем схему: пасля знакаў прыпынку.

**Замацаванне вывучанага.**

***Гульня “Пазнай слова”.***

Умова: пазнай слова па яго лексічным значэнні; пры неабходнасці выкарыстоўваюцца малюнкі-падказкі, пасля тлумачэння арфаграмы словы запісваюцца ў сшытку.

1. Цыркавы артыст-комік (клоўн).




2. Буйная афрыканская птушка атрада бегуноў (страус).




3. Конны пастух у стэпах Паўночнай Амерыкі (каўбой).




4. Пышнае сцэнічнае відовішча з удзелам артыстаў эстрады, цырка (шоу).



5. Адзін з самых буйных прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія вымерлі ў мезазойскую эру (дыназаўр).




6. Падарожны куфэрак круглаватай формы (баул).




7. Удзельнік палёту ў космас (касманаўт, астранаўт).




8. Нарада ўрачоў для вызначэння характару захворвання і спосабаў яго лячэння (кансіліум).




9. Верхняя частка адзення, якая аблягае шыю (каўнер).




10. Перакладзіна для адкрывання і закрывання шляху (шлагбаум).




*Якія з дадзеных слоў вы пачулі ўпершыню?

Праца каля дошкі.

Пр.53. Умова: спішыце, устаўляючы літару **у** ці **ў**, растлумачце іх напісанне.

***Праверка засваення тэарэтычных ведаў.***

***Гіпотэза:***
**літару у пішы ў пачатку сказа, пасля зычных і пасля знакаў прыпынку, а літару ў – пасля галосных**

**пацвердзілася:**
***поўнасцю***
***часткова***
***не пацвердзілася***

*Звяртаемся да гіпотэзы.

Як яна пацвердзілася: поўнасцю, часткова, не пацвердзілася? Сваю думку дакажыце.

(Часткова, таму што літара **у** ў беларускай мове пішацца і пасля галосных: пад націскам, у канцы іншамоўных слоў, у тым ліку на **ум, ус**, у пачатку ўласных імён).

**IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ УРОКА. РЭФЛЕКСІЯ**




Прадоўжыце сказы:
–На ўроку мне больш за ўсё спадабалася…
–Цяжкасці выклікала…

**Настаўнік.** Закончыць наш урок хочацца словамі з верша Г. Бураўкіна, у якіх аўтар заклікае вывучаць родную мову і пазнаваць яе таямніцы:

Мова продкаў нашых і нашчадкаў,
Шэпт дубровы і пчаліны звон,
Нам цябе ласкава і ашчадна
Спазнаваць ажно да скону дзён.

**V. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ**

§8, пр. 55.